*В. В. ВОЛКАВА*

# АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ НЯМЕЦКАЙ АКУПАЦЫЙНАЙ ЗОНЫ ОБЕР ОСТ (1915—1918 гг.)

Пасля ўстанаўлення ў кастрычніку 1915 г. лініі фронту Дзвінск — Браслаў — Паставы — Смаргонь — Баранавічы — Пінск — Луцк паміж нямецкімі і расійскімі войскамі некаторыя беларускія землі апынуліся пад акупацыяй. На частцы занятых нямецкімі 8-й, 9-й і 12-й арміямі было створана вайсковае адміністрацыйнае ведамства Обер Ост з агульнай плошчай 108,8 тыс. км$^2$. Афіцыйная назва «Обер Ост» (*Ober Ost*) узнікла ад скарачэння нямецкай назвы вайсковай пасады фельдмаршала Гіндэнбурга — Вярхоўнага Галоўнакамандуючага на Усходзе (*Oberbefehlshaber Ost*). Пазней так сталі называць усю мясцовую нямецкую адміністрацыю, а таксама тэрыторыі, што знаходзіліся пад юрысдыкцыяй Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

Нягледзячы на пэўныя поспехі навуковага даследавання гісторыі нямецкай акупацыі ў гады Першай сусветнай вайны, праблематыка фарміравання ўнутранай структуры зоны Обер Ост вывучана недастаткова. У сучаснай айчыннай [1; 2; 4; 6] і замежнай [8; 11; 17; 20—24] гістарыяграфіі гэты аспект закранаецца толькі ўскосна. Фактычна, за ўзор прымаецца наступны сказ: «Пасля некалькіх зменаў да вясны 1917 г. адміністрацыйна-тэрытарыяльная структура Обер Ост уключала тры акругі: Курляндыю, Літву і Беласток — Гродна». Схематычнае паказванне дадзенай праблемы не дае поўнага і яснага ўяўлення зменаў тэрытарыяльнага падзелу, які ўплываў на адміністрацыйную палітыку нямецкіх улад у першую чаргу па эканамічных накірунках.

Мэтай гэтага даследавання з'яўляецца аналіз этапаў фарміравання адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу зоны Обер Ост. Храналагічныя рамкі абумоўлены, з аднаго боку, устанаўленнем лініі нямецка-расійскага фронту восенню 1915 г., з другога — канчатковым фарміраваннем структуры нямецкай зоны Обер Ост у пачатку 1918 г.

**Пачатак фарміравання ўнутранай структуры нямецкай акупацыйнай зоны Обер Ост.** На чале акупацыйнай зоны Обер Ост стаў шэф Гене-

---

**Волкава Вольга Віктараўна** — аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

---

ральнага Штаба генерал Эрых Людэндорф (*Erich Ludendorff*) пад агульным кіраўніцтвам камандуючага Усходнім фронтам фельдмаршала Паўля фон Гіндэнбурга (*Paul von Hindenburg*). Пасля таго як П. Гіндэнбург атрымаў пасаду кіраўніка германскага Палявога генеральнага штаба, а Э. Людэндорф стаў пры ім генерал-квартэрмайстрам (намеснікам кіраўніка штаба), Вярхоўным Галоўнамандуючым на Усходзе 29 жніўня 1916 г. быў прызначаны прынц Леапольд Баварскі (*Prinz Leopold von Bayern*).

На чале адміністрацыі занятых тэрыторый знаходзілася Галоўнае ваеннае ўпраўленне Обер Ост (*Zentralverwaltung*), якое ад пачатку восені 1915 г. размяшчалася ў Коўне, 25 студзеня 1917 г. было перанесена ў Беласток [5], а згодна з пастановай Вярхоўнакамандуючага на Усходзе Abt.II 1883/18 ад 28 мая 1918 г. перамяшчалася зноў у Коўна [19]. Узначальваў Галоўнае ваеннае ўпраўленне Галоўнакамандуючы на Усходзе П. Гіндэнбург. Разам з ваенным штабам генерала Э. Людэндорфа ствараўся вялікі адміністрацыйны штаб, на пасаду кіраўніка якога 4 лістапада 1915 г. быў прызначаны генерал фон Эйзенгарт-Роцэ (*Eisenhart-Rothe*) [21, s. 80]. Ён меў у сваім складзе наступныя аддзелы: I—IV — выключна вайсковыя, палітычны (*Abteilung V*), фінансаў (*Ab.VI*), сельскай гаспадаркі (*Ab. VIIa*), лясніцтва (*Ab. VIIв*), царкоўных і школьных спраў (*Ab. VIII*), юстыцыі ((*Ab. IX*), прэсы (*Ab. X*), гандлю (*Ab. XI*), культуры краю (*Ab. XII*). Самым галоўным з аддзелаў лічыўся палітычны. Яго мэтай было падтрыманне сувязі паміж ваеннымі кіраўнікамі новаўтворанай ваенна-адміністрацыйнай адзінкі з цывільнымі і ваеннымі ведамствамі ў Германіі. Унутраная структура Обер Ост пачала фарміравацца фактычна ўжо з кастрычніка 1915 г., якая, як пісаў у сваіх мемуарах генерал Э. Людэндорф, прымала рысы сапраўднай «ваеннай дзяржавы» [3]. Першапачаткова ўся адміністрацыйная ўлада на акупаванай тэрыторыі канцэнтравалася непасрэдна ў руках Вярхоўнага Галоўнакамандуючага і яго штаба. Асновай для фарміравання сістэмы кіравання Обер Ост сталі тылавыя ўправы (*Etappen-Inspektion*) асобных армій: VIII (Курляндыя), IX (Беласточчына), X (Віленшчына) і XII (Гродзеншчына). Пасля ўпарадкавання адміністрацыйнага падзелу да сакавіка 1916 г. Обер Ост меў шэсць абласцей кіравання — ваенных упраўленняў (*Verwaltungsbezirk*): Курляндыя, Літва, Вільня, Сувалкі, Беласток, Гродна. Ваеннае ўпраўленне Курляндыя мела 2 горада са статусам асобнага краявога раёна (*Stadtkreis*) і 8 краёвых раёнаў (*Landkreis*), Літва адпаведна — 1 і 19, плошча складала 36 300 км$^2$ , Вільня (адпаведна 1 і 5) — 9300 км$^2$, Сувалкі (7 краёвых раёнаў) з плошчай 14 900 км$^2$, Беласток (1 і 7) — 17 500 км$^2$, Гродна (1 і 4) — 9100 км$^2$ [26, s. 7]. Аднак унутраная структура як самой зоны Обер Ост у

цэлым, так і структура асобных ваенных упраўленняў яшчэ неаднаразова змянялася. Так, 8 сакавіка 1916 г. шэфам Генеральнага Штаба Обер Ост Э. Людэндорфам была падпісана пастанова, згодна з якой з 1 красавіка горад Гродна выдзяляўся з павета Гродна і станавіўся асобным паветам [12]. А 16 красавіка 1916 г. штаб-кватэра ваеннага ўпраўлення Літва была перанесена з Тыльзіта ў Коўна [22].

1 мая 1916 г. ліквідавалася ваеннае ўпраўленне Сувалкі, а яго тэрыторыя далучалася да ваеннага ўпраўлення Вільня. Аб'яднаная ваенная адзінка, якая атрымала назву «Ваеннае ўпраўленне Вільна — Сувалкі» (*Verwaltung Wilna/Suwalki*), мела сядзібу ў Вільні [10]. Амаль праз год, 16 сакавіка 1917 г., упраўленне ўлілося ў ваеннае ўпраўленне Літва [26, s. 6]. 1 лістапада 1916 г. былі аб'яднаны ваенныя ўпраўленні Гродна і Беласток (*Militärverwaltung Bialystok — Grodno*) [15]. Адміністрацыйная структура вясной 1917 г. падзялялася на тры адміністрацыйныя адзінкі: Курляндыю (19 139 км$^2$), Літву (63 275 км$^2$) і Беластоцка-Гродзенскую акругу (усяго 26 394 км$^2$) [16, s. 433]. Паводле падлікаў польскага гісторыка Ю. Туронка, з агульнай плошчы акругі Беласток – Гродна на сучасную тэрыторыю Польшчы прыпадае каля 9,2 км$^2$, а на Беларусь — каля 17,2 км$^2$. На адрэзку ад Ліды да Браслава ўсходняя мяжа Обер Ост амаль супадала з сучаснай мяжой паміж Літвой і Беларуссю [8, с. 204].

Ваенныя ўпраўленні, у сваю чаргу, падзяляліся на паветы ці раёны (*Kreis*), колькасць якіх на працягу ўсяго існавання Обер Ост вагалася. Так, згодна працы «Краіна Обер Ост. Нямецкая праца ў Курляндыі, Літве і Беласток – Гродна» (*Das Land Ober Ost. Deutsche Arbeit in den Verwaltungsgebieten Kurland, Litauen und Bialystok — Grodno*) [25], Обер Ост падзяляўся на 58 паветаў, у тым ліку 6 гарадскіх: Курляндыя мела 10 паветаў, Літва — 34 паветы і Беластоцка-Гродзенская акруга — 14 паветаў [16, с. 434]. У прыватнасці, у ваеннае ўпраўленне «Курляндыя» ўваходзілі наступныя паветы: Лібаў (*Libau, Stadtkreis*), Мітава (*Mitau, Stadtkreis*), Доблен (*Doblen*), Тукум (*Tuckum*), Віндава (*Windau*), Тальсан (*Talsen*), Голдзінген (*Goldingen*), Хацэнпот (*Hazenpot*), Гробін (*Grobin*), Баўстэ (*Bauste*). У ваеннае ўпраўленне «Літва» ўваходзілі наступныя гарады: Кретынга (*Russisch-Krottingen*), Сяды (*Siady*), Акмяна (*Okmiany*), Шаўляй (*Schaulen*), Ёханішкеле (*Johanischkele*), Біржы (*Birszy*), Тэльшы (*Telsze*), Куршаны (*Kurszany*), Кейданы (*Kiejdany*), Поневаж (*Poniewiez*), Вежайцы (*Wiezajcie*), Скаўдвіле (*Skaudwile*), Паюжжа (*Pojurze*), Расены (*Rossienie*), Купзішкі (*Kupzischki*), Узяны (*Uziany*), Ракішкі (*Rakischki*), Сальдугішкі (*Saldugischki*), Вількамеж (*Wilkomierz*), Коўна (*Kowno, Stadtkreis*), Коўна (*Kowno, Landkreis*), Владыславаў (*Wladislawow*), Вылкавішкі (*Wylkowysch-*

*ki*), Мар'ямпаль (*Marjampol*), Сувалкі (*Suwalki*), Сейны (*Sejny*), Аўгустоў (*Augustow*), Кошадары (*Koszedary*), Шырвінты (*Schirwinty*), Маляты (*Maljaty*), Падброжжа (*Podbrodzie*), Вільня (*Wilna, Stadtkreis*), Вільня *(Wilna, Landkreis*), Аліта (*Olita*). У ваеннае ўпраўленне «Беласток – Гродна» ўвайшлі: Гродна (*Grodno, Stadtkreis*), Гродна (*Grodno, Landkreis*), Ліда (*Lida*), Планты (*Planty*), Васілішкі (*Wasilischki*), Радунь (*Radun*), Ост (*Ost, Zdzienciol*), Валкавыск (*Walkawysk*), Алекшыцы (*Alekszice*), Саколка (*Sokolka*), Беласток (*Bialystok, Stadtkreis*), Беласток (*Bialystok, Landkreis*), Бельск (*Bielsk*), Свіслач (*Swislocz*).

Паветы (*Kreis)*, у сваю чаргу, падзяляліся на староствы (*Amtsbezirk*), якія аб'ядноўвалі некалькі вёсак ці маёнткаў. На чале старостваў, па прызначэнні кіраўніка павета, прызначаліся старасты (*Amtsvortseher*), адпаведна ў малых гарадах і мястэчках бургамістры (*Bürgemeister*). Адміністрацыю на месцах прадстаўлялі так званыя «мясцовыя прадстаўнікі» (*Ostvorsteher*), у маёнтках — *Gutsvorsteher*. У беларускай мове няма дакладнага адпаведніка для перакладу дадзеных пасадаў [18].

**Змены ўнутранай структуры зоны Обер Ост.** Падзел акупіраванай тэрыторыі на тры часткі не стаў канчатковым: ужо загадам Галоўнакамандуючага на Усходзе генерал-фельдмаршалам прынцам Леапольдам Баварскім 27 снежня 1917 г. скасоўваліся паветы (*Militärkreisamt*) Сувалкі і Аўгустоў (ад 1 студзеня 1918 г.). Замест іх утваралася самастойнае раённае ўпраўленне Сувалкі (*Militärkreisverwaltung*), якое выключалася з-пад юрысдыкцыі ваеннага ўпраўлення «Літва» і падначальвалася непасрэдна Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму, складаючы самастойную мабільную ваенную адзінку. У ваенных адносінах новая адміністрацыйная адзінка падпарадкоўвалася галоўнаму камандаванню 10-й Арміі. Узначальваў яе кіраўнік павета (*Kreishauptmann*) капітан Герке (*Gehrke*) [13].

27 студзеня 1918 г. была падпісана пастанова, згодна якой з 1 лютага 1918 г. ваенныя ўпраўленні «Літва» і «Беласток — Гродна» аб'ядноўваліся ў складзе «Ваеннага ўпраўлення Літва» («*Militärverwaltung Litauen*») з галоўнай сядзібай у Вільні [14]. Новаўтвораная адзінка складалася з двух раёнаў, межы якіх адпавядалі ранейшым упраўленням, адпаведна пад назвамі «Літва — поўнач» і «Літва — поўдзень» («*Litauen, Bezirk Nord*», «*Litauen, Bezirk Süd*»). Кіраўніком аб'яднанай адзінкі стаў ротмістр фон Хепе (*von Heppe*), ранейшы шэф ваеннага ўпраўлення «Беласток — Гродна». Яго намеснікамі ў «Літва — поўнач» сталі капітаны запасу Гілза (*Gilsa*) і Шон (*Schön*), у «Літва — поўдзень» — капітан запасу фон Узлар (*von Uslar*). Усе распараджэнні кіраўніка «Ваеннага ўпраўлення «Літва» былі абавязковымі для выканання ў двух раёнах,

але самастойныя лясныя ваенныя ўпраўленні «Белавеж», «Беласток», «Гродна» знаходзіліся па-за межамі яго юрысдыкцыі.

Знешнія межы ваеннага ведамства Обер Ост кантраляваліся праз сістэму мытных застаў. На межы паміж уласна нямецкімі (*Heimatsgebiet*) і занятымі тэрыторыямі Обер Ост у пачатку 1916 г. былі ўстаноўлены адпаведныя пункты мытні. Толькі праз іх дазвалялася вывозіць і ўвозіць тавары. На астатніх пераездах транспарт з грузамі не прапускаўся. Асобы, якія былі затрыманы пры спробе пераправы тавараў праз мяжу, караліся згодна заканадаўству [9].

Наконт назвы рэшткі акупіраваных беларускіх зямель у гістарыяграфіі існуюць два погляды. Так, польскі гісторык беларускага паходжання Ю. Туронак уключае тэрыторыю плошчаю каля 33 тыс. км$^2$ з населенымі пунктамі Ашмяны, Наваградак, Слонім, Баранавічы, Пінск, Пружаны, Кобрын у склад вайскова-аперацыйнай паласы (*Operationsgebiet*) паміж граніцай Обер Ост і лініяй нямецка-расійскіх акопаў [8, с. 13]. Беларускі гісторык У. Ляхоўскі тую ж тэрыторыю (Берасцейскі, Кобрынскі, частку Пружанскага і Пінскага паветаў, а таксама тэрыторыю Валыні) адносіць да тылавога раёна (*Rückwärtiger Verwaltungsbezirk*) нямецкага Усходняга фронту [2, с.76].

Усходняя мяжа Обер Ост супадала з нямецкімі тэрытарыяльнымі намаганнямі ў Расіі. Разам з усходняй мяжой запланаванай польскай дзяржавы яна павінна была падзяліць тэрыторыі панавання Германіі і Расіі. Землі, далучаныя да Обер Ост, якія мясціліся ў трохкутніку Гродна — Ліда — Брэст і складалі каля 8 % сучаснай тэрыторыі Беларусі, немцы лічылі часова акупіраванымі. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі ў розных палітычных лагерах Германіі прадбачылася змена ўсходняй мяжы Обер Ост: «На поўдні Вярхоўнае кіраўніцтва задаволіцца тым, што будзе мяжа па лініі Беласток — Нёман на поўдзень ад Ліды. Белавежская пушча павінна быць набыта як дзяржаўная маёмасць» [7, с. 719].

Адносна абшараў, здабытых пасля наступу ў лютым 1918 г., нямецкі ўрад таксама не меў анексійных намераў. Яны павінны былі адыграць ролю разменнай пазіцыі ў будучых мірных перагаворах. Таму становіцца зразумела, чаму нямецкі ўрад не падтрымлівае ў 1918 г. нацыянальныя праекты: стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы, канфедэрацыю Літвы і Беларусі ці ўключэнне або федэралізацыю беларускіх зямель з Польшчай.

Абагульняючы сказанае, нельга не пагадзіцца з тым, што ваенна-адміністрацыйнае ведамства Обер Ост уяўляла сабой утварэнне з даволі складаным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам. Цэнтралізава-

ная адміністрацыйная сістэма па ланцужку павет — упраўленне — ведамства, шматлікія межы паміж паветамі і ваеннымі ўпраўленнямі з уласцівымі характарыстыкамі (неабходнасць атрымання патрэбных дакументаў для пераходу мяжы, аплата дазволаў) фактычна была абумоўлена мэтамі, якія ставіла перад сабой акупацыйная ўлада. У першую чаргу такі падзел дазваляў «замкнуць» насельніцтва па месцы жыхарства (рэгістрацыі) і пазбегнуць пагрозы супраціву, шпіянажу; па-другое, прымусіць выконваць накладзеныя абавязацельствы: апрацоўваць палеткі, аплачваць розныя падаткі і выконваць прымусовыя работы.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Бабков, А. М.* Политика германского империализма в Белоруссии в годы Первой мировой войны: автореф. дис. ... канд. ист. наук / А. М. Бабков. Минск, 1983. 23 с.
2. *Ляхоўскі, У.* Школьная адукацыя на Беларусі падчас нямецкай акупацыі 1915—1918 гг. / У. Ляхоўскі. Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства; Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2010. 340 с.
3. *Людендорф, Э.* Мои воспоминания о войне 1914—1918 гг. / Э. Людендорф М. ; Минск : АСТ, Харвест, 2005. 800 с.
4. *Мигун, Д. А.* Германия и Беларусь: уроки истории (1914—1922) / Д. А. Мигун. Минск : РИВШ БГУ, 2001. 62 с.
5. Наш край // Гомон. 1917. 9 кастр.
6. *Рудовіч , С. С.* Беларусь у гады Першай сусветнай вайны / С. С. Рудовіч // Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII — пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Экаперспектыва, 2005. Гл. 5. С. 434—487.
7. Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до подписания Раппальского договора. М. : Изд-во полит. лит-ры, 1968. Т. 1. 830 с.
8. *Туронак, Ю.* Беларусь пад нямецкай акупацыяй / пер. з польск. В. Ждановіча, камент. А. Літвіна / Ю. Туронак. Мінск : Беларусь, 1993. 236 с.
9. Armee — Tagesbefehl der 10. Armee. Abtlg. II b. № 3263. 16, 18. Februar 1916 // ЛДГА. Ф. 641. Воп. 1. Спр. 1059. А. 53.
10. Armee — Tagesbefehl der 10. Armee. Abtlg. II b. № 8604. 16 1.Mai 1916 // ЛДГА. Ф. 641. Воп. 1. Спр. 1059. А. 121.
11. *Basler, W.* Deutschlands Annexionspolitik in Polen und im Baltikum 1914—1918 / W. Basler. Berlin : Rütten&Loening, 1962. 441 s.
12. Befehls — und Verordnungsblatt des Oberbefehlshabers Ost, № 15. Z. 111 // ЛДГА. Ф. 641. Воп. 1. Спр. 883ad. А. 99 адв.
13. Befehl betreffend der Auflösung der Militärkreisämter Suwalki und Augustow. Befehls- und Verordnungsblatt № 97, Ziffern 691 // ЛДГА. Ф. 641. Воп. 1. Спр. 966. А. 2.
14. Befehl betreffend die Zusammenlegung der Militärverwaltungen Litauen und Bialystok-Grodno. Befehls — und Verordnungsblatt № 98, Ziffern 695 // ЛДГА. Ф. 641. Воп. 1. Спр. 966. А. 5 адв.
15. Berliner Tagesblatt, 02.XI. 1916, Frankfurter Zeitung, 02.XI. 1916 // AAN. Ф. 39. Спр. 100. S. 554—555.

16. Das Land Ober Ost. Deutsche Arbeit in den Verwaltungsgebieten Kurland, Litauen und Bialystok-Grodno. Berlin — Stuttgart : Verlag der Presseabteilung Ober Ost, 1917. 472 s.

17. Die vergessene Front. Der Osten 1914/1915. Ereignis, Wirkung, Nachwirkung / Im Auftrag des Militärgeschichtlischen Fotschungsamtes herausgegeben von Gerhard P. Groß. Paderborn — München — Wien — Zürich : Ferdinand Schцningh, 2006. 560 s.

18. «Dziennik Pietrogrodski», 20.V.1917 // AAN. Ф. 39. Pudio 101. S. 154.

19. Etappen — Tagesbefehl der Etappen-Inspektion der 10. Armee. 28.Mai 1918 // Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (ЛДГА). Ф. 641. Воп. 1. Спр. 963d. А. 305.

20. *Kamiski, S.* Likwidacja stanu I wojny światowej na Suwalszczyźnie. Walka o wyzwolenie spod okupacji niemieckiej (listopad 1918 r. — sierpień 1919 r.) / S. Kamiski // Rocznik Bialystocki. 1981. № 15, 1981. S. 91—116.

21. *Liulevicius, V. G.* Kriegsland im Osten. Eroberung, Kolonisierung und Militärherrschaft im Ersten Weltkrieg 1914—1918 / V. G. Liulevicius. Hamburg: Hamburger Edition, 2002. 374 s.

22. Sammelakten betreffend Verwaltungsbefehle und Verwaltungsberichte von Litauen (15.X.1915 — I.X.1916). SVIII. Documents. Delegation Polonaise a la Conference de la Paix Delegation Ekonomique. N 987. Serie I.9. Date 22.V.1919 // Arciwum Akt Nowych (AAN). Ф. 39. Спр. 926. А. 3—6.

23. *Strazhas, A.* Deutsche Ostpolitik im Ersten Weltkrieg: Der Fall Ober Ost, 1915—1917/ A. Strazhas. Wiesbaden : Harrassowitz, 1993. (Veröffentlichungen des Osteuropa — Institutes München. Reihe: Geschichte; Bd.61). 289 s.

24. *Sukiennicki, W.* Pocz tki Ober Ostu i sprawa konfederacji W. Ks. Litewskiego w 1915—1916 / W. Sukiennicki // Zeszyty Historyczne-Instytut Literacki. 1974. № 28. S. 99—104.

25. Tagesbefehl der Etappen-Inspektion der 10. Armee . 2. Juni 1917 // ЛДГА. Ф. 641. Воп. 1. Спр. 963ad. А. 83.

26. *Zemke, H.* Der Oberbefehlshaber Ost und das Schulwesen im Verwaltungsbereich Litauen während des Weltkrieges/ Schriften der Kriegsgeschichtlichen Abteilung im Historischen Seminar der Friedrich —Wilhelms — Universität Berlin / H. Zemke. Berlin : Junker und Dünnhaupt Verlag, 1936. 120 s.

## РЭЗЮМЭ. SUMMARY

Исследуются правовой и территориальный аспекты изменений административного деления немецкой оккупационной зоны Обер Ост после установления линии фронта Двинск – Браславль – Поставы – Сморгонь – Барановичи – Пинск – Луцк осенью 1915 г.; рассматривается процесс формирования административных единиц.

In the article the legal and territorial aspects of changes of administrative borders within the bounds of the German occupation zone Ober Ost after determination of the front line Dvinsk — Braslav — Postavy — Smorgon — Baranovitchi — Pinsk — Lutsk in autumn of 1915 is investigated. The process of formation of the administration of districts is studied.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 30 сакавіка 2010 г.